Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2014 г.**

**да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 70-годдзя вызвалення г. Кобрына і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

*5 ліпеня*

Літаратурна-музычная кампазіцыя да 70-годдзя вызвалення Беларусі ***"Нашай памяці звоняць званы"*** .

На працягу двух гадзін наведвальнікам былі прадстаўлены:
агляд краязнаўчых матэрыялаў з фонду Дзівінскай с/б ***"У гарачым полымі вайны",*** тэматычная гадзіна ***"Вогненныя вёскі Кобрыншчыны"*** літаратурна-музычная кампазіцыя ***"Помніць сэрца…"*** .

*Дзівінская СБ, 58 чал.*

*5 ліпеня*

Дзень гісторыі ***"Дорогами войны"***. У праграме:

- прадмова аб урачыстай даце - 3 ліпеня;
- фотавыстава здымкаў ветэранаў ВАВ;
- расказ аб ветэранах ВАВ: Мартынчуке В.Ф. і Салівончыку В.В;
- сумесны прагляд дакументальных стужак аб ВАВ.

*Шамятоўская СБ, 25 чал.*

*6 ліпеня*

Выступленне ЛПГ ***"Война: и боль, и память, и урок»***. Да ўвагі чытачоў былі прадстаўлены кнігі аб вайне на выставе ***"Даўным –даўно завершан бой"*** і электронная прэзентацыя.

*Повіцьеўская СБ, 10 чал.*

*13 ліпеня*

Урок памяці ***"Граница рождает героев»***. У праграме:

- кніжная выстава "Каб каменні маглі гаварыць…";
- расказ аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці;
- выступленне ЛПГ з вершамі П. Броўкі, А. Астрэйка, М. Калачынскага.

*Гайкоўская СБ, 15 чал.*

*16 ліпеня*

На абанеменце арганізавана панарамная экспазіцыя **"Подзвіг. Перамога. Памяць"**, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі і горада Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Панарамную экспазіцыю складаюць:

- выстаўка–памяць, на якой прадстаўлены кнігі, артыкулы, плакаты, фотаальбомы, буклеты;
- выстаўка лепшых кніг аб вайне "У кніжнай памяці імгненні вайны".

Дапаўняюць экспазіцыю франтавыя пісьмы, якія прадстаўлены ў раздзеле "Франтавыя пісьмы – лёс, каханне і надзея".

*ЦБ*

*20 ліпеня*

Да 70 – годдзя вызвалення г. Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ЦБ правяла свята чытацкіх задавальненняў пад адкрытым небам ***«Чытанне для добрага настрою»***. У праграме свята: літаратурна-музычная кампазіцыя «Ёсць у горада слава гордая», парад кніжных выстаў, бібліякафе, буккросінг, віктарына «Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю», пляцоўка чытаючага дзяцінства, свабодны паэтычны мікрафон «І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкаю ». На свяце выступіў хор аматарскага клуба "Сустрэча" і члены народнага паэтычнага клуба "Белы бусел".

*ЦБ і ДБ, 200 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

*11 ліпеня*

Практыкум для сельскіх бібліятэкараў па стварэнні паўнатэкставых краязнаўчых баз дадзеных "Краязнаўства ў электронным фармаце". Падчас вучобы разглядаліся такія пытанні, як: адбор краязнаўчых матэрыялаў з электроннай кнігі "Памяць. Кобрынскі раён ", выкарыстанне сайта газеты "Кобрынскі веснік", пошук краязнаўчых дакументаў у сетцы Інтэрнэт, алічбоўка краязнаўчых матэрыялаў і г. д.

*ЦБ, 45 чал.*

*12-21 ліпеня*

12 ліпеня на базе мінулай школы адбыўся “12 всемирный слёт саратников общественной безопасности и славянистов”. На злёт прыехалі прадстаўнікі 14 краін свету. На працягу ўсяго злёта былі праведзены розныя мерапрыемствы, напрыклад: лекцыя “Сучасная геапалітыка і месца рускай цывілізацыі ў свеце”, выступленне калектыва “Бурштын”, свята Пяруна.

*Аніскавіцкая СБ, 270 чал.*

*20 ліпеня*

Літаратурная гадзіна “Отдохнём с пользой”. У праграме: вандроўка па Чырвонай кнізе Беларусі, віктарына “Звери”, хвілінка ведаў “Там чудеса, там зубры бродят…”.

*Балоцкая СБ, 15 чал.*

## Выдавецкая дзейнасць

*15 ліпеня*

Бібліёграфамі да Дня горада Кобрына выдадзены бібліяграфічны летапіс ***“Яны вызвалялі наш горад”***, прысвечаны 70-годдзю вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Кобрына. У аснову паказальніка пакладзены дакументы і матэрыялы з кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна”, успаміны ўдзельнікаў вызвалення Кобрына, артыкулы з перыядычных выданняў, кніг.

*ЦБ*

*15 ліпеня*

Да 70-годдзя з Дня вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бібліёграфамі створана БД “Залатая зорка Кобрына: У.М. Кірмановіч, Герой Савецкага Саюза”.

*ЦБ*

*18 ліпеня*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана паўнатэкставая база сцэнарных матэрыялаў па Беларусі "Шануйце дзіва на планеце - святую нашу Беларусь".

*ЦБ*

*21 ліпеня*

Бібліёграфамі ЦБ выдадзены біябібліяграфічны паказальнік «Іншым разам радок дыктуе само неба…» з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння кобрынскага пісьменніка, драматурга, фатографа Ігара Сідарука. Выданне знаёміць з біяграфіяй аўтара, яго творчасцю, даецца бібліяграфічнае апісанне мноства крыніц, якія адлюстроўваюць творы І. Сідарука і літаратуру аб жыцці і творчасці. Біябібліяграфічны паказальнік ілюстраваны.

*ЦБ*

Выканаўца: Мілашук Т. І.
аддзел бібліятэчнага маркетынгу